# Прыстанак Каралевы Палесся



**Жадаеце пазнаёміцца з Каралевай Палесся, даведацца, хто такі тандэтнік, і ўбачыць ваўка з лісіным хвастом і на ласiных нагах? Калі ваш адказ станоўчы, то наведаемся ў Лагішын – гарадскі пасёлак на Берасцейшчыне. Надзейным правадніком нам будзе настаўніца гісторыі мясцовай школы, краязнаўца Святлана Юшкевіч.**



Святлана ЮШКЕВІЧ.

### «Прывілеі на вечныя часы»

Лагішын вядомы з 1552 года. Гэты населены пункт пабыў у складзе і Вялікага княства Літоўскага, і Расійскай імперыі, і Польшчы. Дарэчы, менавіта польскі кароль Уладзіслаў IV па просьбе пінскага старасты Альбрэхта Радзівіла падарыў мястэчку «...права Магдэбургскае з усімі прывілеямі, вольнасцямі на вечныя часы... ». Тэкст дакумента напісаны на тонка вырабленым пергаменце на польскай мове з

картка пасёлка. Кім і калі быў ён напісаны, невядома. На Палессе патрапіў падчас вайны са шведамі. Тады адзін з афіцэраў застаўся на начлег у мясцовага старасты. Загорнуты ў палатно абраз пакінуў у сенях. І калі раптоўна загадалі рушыць у паход, забыўся пра каштоўнасць. Староста ж перадаў абраз у храм, і ў хуткім часе людзі паверылі ў яго цудадзейнасць. У вёсцы адбыўся страшэнны пажар. Агонь знішчыў многія дамы вакол касцёла, але сама святыня ўцалела

ванні вырашаліся на карысць апошніх – суд патрабаваў вярнуць абраз у касцёл, паколькі ён першапачаткова знаходзіўся там. У 30-х гадах мінулага стагоддзя ікона была аднаўлена і ўрачыста змешчана ў галоўным алтары каталіцкай святыні.

– Культ Маці Божай Лагішынскай з кожным годам толькі пашыраўся. У 1990-х сам Папа Рымскі збіраўся прыехаць да нас, каб каранаваць абраз. На жаль, ў яго не атрымалася, і ён



напісаны на тонка вырабленым пергаменце на польскай мове з невялікімі ўстаўкамі на латыні. Дзякуючы Магдэбургскаму праву лагішынцам дазвалялася пабудаваць ратушу і побач «мецъ гандаль і шынкі».

Войт, які ўзначальваў самакіраванне, павінен быў выносіць на суд справы аб падпалах, пабоях, злачынствах, сямейных здрадах і нават чараўніцтвах. Для мястэчка ўстанаўліваліся штогадовыя двухтыднёвыя кірмашы: зімні – на Каляды і летні – пачынаючы са свята апосталаў Пятра і Паўла. Насамрэч, вядомы яны былі далёка за межамі мястэчка – сюды прыязджалі, каб набыць добрую жывёлу, купіць нешта незвычайнае ці патрэбнае для гаспадаркі. Ганчары, кавалі, шаўцы і іншыя майстры гандлявалі адмысловым таварам. Тандэтнікаў – бракаробаў, значыць, тут не цярпелі.

– Цікава каралеўскае прадпісанне наконт мядовых напояў, – распавядае Святлана Юшкевіч. – Лагішынцы маглі гатаваць іх чатыры разы на год. А ў выпадку продажу павінны былі набываць у якасці падатку свечачны воск для касцёла і царквы: «каб за грэшнай справай не забывацца на святое...».

### Цудадзейны абраз

Абраз Маці Божай Лагішынскай, якую называюць Каралевай Палесся, – сапраўдная візітная

знішчыў многія дамы вакол касцёла, але сама святыня ўцалела. Мясцовыя жыхары палічылі, што храм захаваўся з дапамогай Маці Божай Лагішынскай, якую наракли апякункай Палесся.

Драўляны касцёл, дзе доўгі час знаходзіўся абраз, быў пабудаваны ў 1634 годзе дзякуючы намаганням Станіслава Альбрэхта Радзівіла. Больш за два стагоддзі служыў касцёл католікам. Аднак пасля паўстання Кастуся Каліноўскага быў перададзены разам з цудадзейным абразам праваслаўным вернікам.

Права збудаваць новы касцёл католікі атрымалі толькі праз 40 гадоў – у 1905-м, калі быў выданы царскі ўказ наконт талерантнасці ў адносінах да вернікаў розных канфесій. У католікаў з'явіўся прыгожы велічны храм. Адно непакоіла – абраз Каралевы Палесся па-ранейшаму знаходзіўся ў праваслаўнай царкве. І аднойчы парафіяне не вытрымалі – патаемна вынеслі ікону з царквы. Некалькі разоў праваслаўныя судзіліся з католікамі. І кожны раз аспрэч-

да нас, як Каралевы абраз. На жаль, ў яго не атрымалася, і ён даручыў гэта зрабіць кардыналу Казіміру Свёнтаку. Урачыстасць адбылася 10 мая 1997 года, – праінфармавала мясцовы краявед.

### З павагай да пярэвараценя

У Беларусі няшмат пасёлкаў, якія маюць свой герб. У Лагішына ёсць, дык яшчэ і дзіўны. На першы погляд, на ім – воўк, але варта прыгледзецца, як заўважыш ногі ласяся, хвост лісы! І гэта пры тым, што ў геральдыцы рэдка выкарыстоўваюць містычных жывёл. Чаму палічылі, што пярэварацень варты быць змешчаным на герб і што яго прымуць людзі? Апошнія ж не толькі прынялі такую выяву, але і ласкава назвалі свайго ваўка Воўсь. Каб знайсці гэтаму тлумачэнне, трэба вярнуцца на многа вякоў назад.

У Сярэднявякоўі палескія землі ўяўлялі сабой непралазныя балоты. Кажуць, што іх і насялялі ваўкі, ды не тыя, якіх ведаем мы, а пярэваратні з ласінымі нагамі, бо на іх лепей пераадольваць балоты, лягчэй



паляваць. Такіх істот называлі воўсямі. Лічылася, што яны валодалі здольнасцю прадбачыць учынкі чалавека. Гэтая істота была прыязнай да людзей, ладзіла з дзецьмі, не рабіла нічога дрэннага. У адказ нават святары з павагай адносіліся да воўся.

– І хоць тыя часы даўно адышлі ў нябыт, але лагішынцы засталіся верныя свайму старажытнаму гербу. У сучаснай Беларусі яго афіцыйны статус пацверджаны 18 верасня 1998 года, – адзначыла Святлана Юшкевіч.

### Супраць войска губернатара

Сярод падзей мінулых стагоддзяў асаблівае месца займае справа, дзякуючы якой лагішынцы даказалі, што маюць годнасць і нікому не дазволяць на яе замахнуцца. Пра так званую «лагішынскую справу» праз газеты

даведалася не толькі ўся Расія, але і замежжа. Гэта было ў 1874 годзе. Мінскі губернатар Токараў вырашыў прысвоіць землі лагішынцаў, але тыя не падпарадкаваліся і засеялі свае надзелы. На расправу з бунтаўшчыкамі адправілі 2 батальёны пяхоты і сотню ці дзве казакоў з загадам узяць па 12 патронаў на кожнага жыхара. Зразумела, войска адолела людзей: з кроўю, але бунт задушылі, 5 завадатараў нават адправілі ў Сібір, астатніх тры дні білі розгамі. Аднак лагішынцы не здаваліся. І, ведаеце, справа скончылася тым, што ім аддалі назад зямлю, несправядліва асуджаных вярнулі дамоў, а Токараў застаўся без пасады – яго спагналі выплаціць на карысць людзей 5474 рублі.

**Маленькі Лагішын заўсёды знойдзе чым здзівіць. Напрыклад, скульптурай Леніна, якую прывезлі сюды ў 1957 годзе з майстэрні народнага мастака СССР, скульптара, акадэміка Заіра Азгура. Ільіч да гэтага часу вітае лагішынцаў і гасцей пасёлка.**

Галіна СТРОЦКАЯ
Фота Карнэлія КОНСЭКА